# СВЯТА ПАМЯЦІ

**Нататкі з Рэспубліканскага фестывалю народнаінструментальнага выканальніцтва, прысвечанага Г. Жыхараву**

Ларыса Таірава



**Удзельнікі зводнага ансамбля Беларускай акадэміі музыкі.**

### АРТЫКУЛ ДРУГІ

Большасць фестывальных канцэртаў праходзіла ў зале Беларускай акадэміі музыкі і аб'ядноўвала прадстаўнікоў усёй рэспублікі. Танальнасць ім задаў асноўны канцэрт у зале Белдзяржфілармоніі, які распачаў гэтае незвычайнае па сваіх маштабах свята.

Аркестр народных інструментаў БелАМ пад кіраўніцтвам Сяргея Кафанава не так даўно адзначыў сваё 40-годдзе. Ён быў заснаваны Г. Жыхаравым і застаецца верны яго традыцыям, прынцыпам высокага акадэмічнага стылю. Уверцюра Д. Смольскага годна адкрывала канцэртную праграму калектыву, кульмінацыяй якой, безумоўна, стала ажурная, вытанчаная «Навара» П. Сарасатэ, дзе саліравалі цымбалісткі, лаўрэаты міжнароднага конкурсу Святлана Верамейчык і Таццяна Мельнікава. Вострая, яскравая п'еса М. Кус «На гулянцы», вытрыманая ў сучасных гармоніях, завяршыла выступленне аркестра.

Ансамблевае пачуццё і высокі прафесіяналізм дазволілі аб'яднаць у адзіны, зладжаны ансамбль некалькі самастойных калектываў, такіх як ансамбль дамрыстаў (кіраўнік — Г. Асмалоўская), ансамбль цымбалістаў (кіраўнік — засл. артыст РБ. Я. Гладкоў) і ансамбль балалаечнікаў (кіраўнік — В. Шчарбак). Зводны ансамбль выступаў пад кіраўніцтвам вядомага дырыжора Г. Ермачэнкава, які прадставіў на суд слухачоў уласны твор — «Жураўліную песню», прасякнутую тонкім лірызмам. Добра прагучалі «Танец скамарохаў» В. Андрэева і вогненна-тэмпераментная «Наварская хота» П. Сарасатэ. Вядома, не абышлося без зухаватай «Беларускай полькі» В. Кузняцова.

Бясспрэчнай сенсацыяй вечара стала выступленне «Мінск-трыо» ў складзе М. Марэцкага, А. Сакалоўскай, І. Атраднава, якое толькі што вярнулася з Італіі са званнем лаўрэата міжнароднага конкурсу. Выдатныя музыканты ўразілі бліскучым выкананнем Тарантэлы К. Сен-Санса і выклікалі сапраўдную авацыю залы, калі ў «Венецыянскім карнавале» Паганіні да іх далучыўся знакаміты госць з Расіі А. Цыганкоў. Няма слоў, каб перадаць тое, што рабілася на сцэне і ў зале!..

Як заўсёды, непераўзыдзеным было выкананне А. Цыганковым (у суправаджэнні Дзяржаўнага аркестра імя І. Жыновіча пад кіраўніцтвам С. Сакалова) уласных твораў — танцавальных найгрышаў, п'есы-жарту «Перевоз Дуня держала», Інтрадукцыі і Чардаша (сумесна з лаўрэатам міжнароднага конкурсу абаяльнай Ларысай Рыдлеўскай).

Трыо баяністаў БелАМ пад кіраўніцтвам Валянціны Пісарчык таксама толькі што вярнулася з Італіі, дзе атрымала званне лаўрэата міжнароднага конкурсу. Ансамбль вызначаецца перш за ўсё сваім яркім канцэртным рэпертуарам, куды ўваходзяць такія выдатныя творы, як «Цыганскія матывы» Канаева, Чардаш Монці (транскрыпцыя Мандруса), «Карэла-фінская полька» ў апрацоўцы Глушчука. І хоць калектыў выступаў у змененым саставе, нязменным заставалася майстэрства музыкантаў, якое пакінула незабыўнае ўражанне.

Прыкметнай з'явай на фестывалі было выступленне наноў адроджанага інструментальнага ансамбля Беларус-



**Госць фестывалю з Расіі Аляксандр Цыганкоў у час выступлення.**

Заканчэнне. Пачатак у № 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кага тэлебачання і радыё пад кіраўніцтвам Аляксандра Арабея. Калектыў, да якога Г. Жыхараў меў калісьці самае непасрэднае дачыненне, павінен жыць! І гэта цудоўна, што знайшліся людзі, сродкі, жаданне і воля, каб надаць ансамблю новае дыханне. Як кажуць — у добры шлях!

Ансамбль народных інструментаў «Барыня» Магілёўскай абласной філармоніі (кіраўнік — Пётр Забелаў) — прыклад мабільнага (усяго чатыры музыканты), яркага калектыву, народнага па сваім стылявым накірунку, дзе добра іграюць, спяваюць і нават скачуць. Ансамбль парадаваў цікавай, прадуманай праграмай, разлічанай на самае шырокае кола слухачоў.

Фестываль пераканаў, што ў нас шмат таленавітых музыкантаў, якія хочуць і могуць добра іграць. Самыя разфаваную тэхніку, цудоўны густ салісткі, а таксама эмацыянальную чуласць аркестра. Сапраўдным адкрыццём з'явілася выкананне Фантазіі на тэму рускай народнай песні «Вячэрні звон» Масолава. Тут адчуваліся не толькі ледзь улоўныя шорахі летняга вечара, але і духмяны водар траў. Аркестравае піяніісіма і чысціня трэмала струнных даведзены да такой ступені, што быў чутны нават подых зачараванай залы! Неверагодна!.. Галоўным нумарам праграмы, безумоўна, была напісаная ў эстрадным стылі Канцэртная п'еса для ксілафона з аркестрам З. Кроціла з непаўторным салістам Анатолем Дамарацкім. Які аркестр!.. Які дырыжор!.. Адным словам — брава!

Аркестр педагагічнага факультэта БелАМ г. Магілёва пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Леаніда Іва-



На сцэне — зводны ансамбль народных інструментаў. Кіраўнік — Генадзь Ермачэнкаў.

настайныя навучальныя ўстановы зрабіліся своеасаблівымі культурнымі цэнтрамі, дзе існуюць цікавыя калектывы, аснову якіх складаюць выкладчыкі. Сярод такіх калектываў трэба адзначыць ансамбль народных інструментаў Гомельскага каледжа мастацтваў імя Н. Сакалоўскага (пад кіраўніцтвам Уладзіміра Птушаненкі) і ансамбль народных інструментаў Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі (кіраўнік — Яраслаў Валасюк). Магілёўскі ліцэй музыкі і харэаграфіі прыслаў на фестываль ажно два вельмі спрактыкаваныя калектывы — ансамбль народных інструментаў пад кіраўніцтвам Сяргея Малініна і трыо баяністаў пад кіраўніцтвам Рыгора Чыбісава. Гэтыя калектывы аб'ядноўвае добрая прафесійная падрыхтоўка і шырокая культурна-асветніцкая дзейнасць за межамі асноўнай выкладчыцкай працы.

Адметнай рысай мінулага фестывалю з'яўлялася тое, што тут не было звыклага аўтарытэтнага журы, не было раздзялення ўдзельнікаў на ўзроставыя, жанравыя катэгорыі з дыпломамі і падарункамі. Тут панавала музыка, святочны настрой і духоўнае яднанне, што надавала фестывалю своеасаблівую дэмакратычную афарбоўку.

Сярод аркестраў, прадстаўленых на фестывалі, як гэта ні парадаксальна, вылучаліся менавіта «перыферыйныя» калектывы. Перш за ўсё — гэта аркестр народных інструментаў Маладзечанскага музвучылішча пад кіраўніцтвам Тамары Бяльковай. На сённяшні дзень гэта, бадай, адзін з лепшых у рэспубліцы калектыў такога тыпу. Яго гучанню, майстэрству могуць пазайздросціць некаторыя прафесійныя калектывы. Кожны гук, кожная партыя ў ім даведзены да філіграннай дакладнасці і збалансаванасці. Выдатная салістка-балалаечніца лаўрэат міжнароднага конкурсу Марына Ільіна вызначыла рэпертуар аркестра. Усе творы з яе ўдзелам — «Кольцо души-девицы» ў апрацоўцы А. Шалава, «Калінка» В. Гарадоўскай, Галоп І. Дунаеўскага з кінафільма «Маё каханне» — выявілі мяккі, цёплы гук, адшлінова чакалі з нецярпеннем. І ён прыехаў, каб падарыць незабыўныя хвіліны радасці, прадставіўшы на суд слухачоў цікавую, разнастайную праграму. Так, «Руская фантазія» Будашкіна прагучала па-сучаснаму, без штампаў. З першых аркестравых гукаў выявіўся почырк прафесіянала, з уласцівай ім дакладнасцю, выверанасцю ўсіх дэталяў. Адчувалася велізарная, мэтанакіраваная праца дырыжора, манера якога вызначаецца мяккасцю, пявучасцю рук, прыгажосцю ўладарных жэстаў. Леанід Іваноў — найбольш яркі паслядоўнік жыхараўскіх традыцый, вучань і паплечнік Г. Жыхарава. Аддаючы даніну памяці цудоўнага музыканта, аркестр выканаў некалькі твораў у інструментоўцы і свабодным пералажэнні Г. Жыхарава. Гэта перш за ўсё выдатны па прагажосці і вытанчанасці Квартэт з оперы «Рыгалета» Вэрдзі, а таксама Канцэртныя варыяцыі для балалайкі з аркестрам П. Кулікова з удзелам саліста Паўла Сапегі. Разлічаная на самы разнастайны густ, праграма ўключала вакальныя творы беларускіх кампазітараў, якія выконвалі навучэнкі Магілёўскага музвучылішча Наталля Анішчанка і Ганна Мілавідава, а таксама рускія народныя песні ў выкананні заслужанага артыста РБ Алега Цівунова. Але цікава тое, што выпрабаваная публіка аддавала перавагу аркестравым, інструментальным нумарам, такім як «Перевоз Дуня держала» А. Цыганкова (салісткі — дамрысткі Вераніка Макарава і Ірына Астрыкава) і шыкоўная, заліхвацкая «Барыня» В. Малых.

Дарэчы, даўно не памятаю я гэткіх цеплыні, шчырасці, гэткага ўзаемаразумення паміж артыстамі і слухачамі, якія панавалі амаль на ўсіх канцэртах. Лілася музыка, узнікалі ўспаміны пра незабыўнае, узнёслы дух вітаў у зале. Здавалася, мы дакранаемся да чагосьці святога.

Так было і ў той вечар, калі аркестр Л. Іванова саступіў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

месца на сцэне аркестру беларускіх народных інструментаў БелАМ пад кіраўніцтвам Віктара Валатковіча. Прафесіяналы ведаюць, якую складаную спецыфіку мае цымбальны аркестр з яго звонкім, адметным гукам. Але тое, што з аркестрам робіць В. Валатковіч, — проста цуд! Ён цалкам падпарадкоўвае гук мастацкім патрабаванням кожнага твора, што дазваляе дасягнуць багатай гукавой палітры, рафінаванай далікатнасці, як, напрыклад, у «Думцы» У. Солтана ці ў Адажыо В. Войціка, якое ансамбль дамрыстаў БелАМ выконваў у суправаджэнні аркестра. А пачатак праграмы быў пазначаны бліскучым Паланезам і элегантнай Мазуркай С. Манюшкі. Да густу прыйшоўся слухачам прыгожы, горды Падэспань А. Цыганкова (салістка — Святлана



**Лаўрэат міжнароднага конкурсу ў Італіі ансамбль «Мінск-трыо» (М. Марэцкі, А. Сакалоўская, І. Атраднаў).**

Верамейчык).

Асновы мастацкай выразнасці В. Валатковіча — выдатнае пачуццё формы, паглыбленая, дынамічная кантрастнасць і, безумоўна, артыстызм. Пэўна, таму заключная частка праграмы прайшла пад «бісавы» акампанемент залы. Ды і як тут было ўстрымацца, калі гучалі такія цудоўныя творы — «Венгерскі танец» І. Брамса, «Картулі» З. Паліяшвілі, зіхатлівая «Вясенняя хора» П. Раду і незабыўная Уверцюра да аперэты «Цудоўная Галатэя» Ф. Зупэ!

Інструментальная капэла «Спадчына» Беларускага універсітэта культуры пад кіраўніцтвам Альбіны Скорабагатчанкі — калектыў ярка выяўленага фальклорнага накірунку. Тым не менш на гэты раз акрамя ўласнага твора «На кірмашы» дырыжор прапанавала слухачам музыку XVIII стагоддзя, у прыватнасці пяшчотную Серэнаду Мацея Радзівіла, — плён нядаўніх пошукаў нашых даследчыкаў.

Аркестр народных інструментаў Мінскага музычнага вучылішча пад кіраўніцтвам эфектнай Людмілы Гінько прадставіў грунтоўную традыцыйную праграму, куды ўвайшлі лепшыя творы В. Гарадоўскай — «Выйду на вуліцу», «Руская зіма». Удалым быў і падбор салістаў. Так, лаўрэат міжнароднага конкурсу вучань Рэспубліканскага ліцэя пры БелАМ Міхаіл Лявончык выдатна сыграў Інтрадукцыю і Чардаш А. Цыганкова ў суправаджэнні аркестра. А вельмі здольная балалаечніца студэнтка III курса вучылішча Таццяна Іванова цудоўна выканала Канцэртныя варыяцыі для балалайкі з аркестрам на тэму песні «Вот мчится тройка почтовая» М. Будашкіна.

Апошнім акордам фестывалю зрабілася выступленне духавога аркестра БелАМ пад кіраўніцтвам Аркадзя Берына з чароўнай спявачкай Ірынай Вішніцкай, якія падарылі асалоду, цудоўна выканаўшы Канцэртную фантазію кампазітара Фарберава на тэмы вальсаў І. Штрауса, а таксама Уверцюру да оперы «Норма» Беліні.

Так атрымалася, што фестываль стаў яшчэ і святам творчасці нашага госця з Расіі А. Цыганкова. Без яго зараз не абыходзіцца ніводны дамрыст, таму што выкананне яго твораў — гэта своеасаблівы паказчык майстэрства ігры на гэтым інструменце. Творы Цыганкова ўзялі «на ўзбраенне» цымбалісты, яго іграюць амаль усе аркестры, нават балалаечнікі. А гэта цудоўна, што кампазітар і выканаўца карыстаецца неверагоднай папулярнасцю. Але... дзе нашы кампазітары? Хіба яны не бачаць, якую жыватворную глебу для іхняй творчасці і папулярнасці ўяўляе народнаінструментальная сфера? Колькі цудоўных музыкантаў чакаюць яркіх, непаўторных твораў! Пакрыўлю душой, калі скажу, што нашы кампазітары зусім не пішуць для «народнікаў». Пішуць, і, здараецца, вельмі добра, але мала і зрэдку. Пажадана, каб выканальніцкая актыўнасць супадала з актыўнасцю кампазітарскай.

Акрамя аркестраў і ансамбляў у фестывалі прымаў удзел шэраг выдатных салістаў. Гэта перш за ўсё вучні Рэспубліканскага ліцэя пры БелАМ лаўрэаты міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў Надзея Дзядзічкіна (домра) і Дзмітрый Атраднаў (баян), якія ўжо цяпер здолелі авалодаць сур'ёзным «дарослым» рэпертуарам і ў якіх наперадзе выдатныя перспектывы. Гэта таксама дамрысткі дыпламанты рэспубліканскага конкурсу імя І. Жыновіча Наталля Мяркулава, Ларыса Буянава, студэнтка IV курса БелАМ Ала Вінаградская. Былі на ўзроўні і нашы цымбалісткі Юлія Кузменка, лаўрэат рэспубліканскага конкурсу імя Жыновіча Аксана Хахол і лаўрэат міжнароднага конкурсу Кацярына Анохіна. У суквецці выканаўцаў-струннікаў годнае месца заняў акардэаніст Генадзь Вінаградскі.

Фестывальны тыдзень праляцеў як адно імгненне. Хочацца спадзявацца, што фестываль, звязаны з імем Георгія Жыхарава, зробіцца традыцыйным, бо гэта самае лепшае ўшанаванне памяці чалавека, які жыве ў сэрцах многіх музыкантаў.

**Фота А. Спрынчана.**



**Выступае аркестр народных інструментаў БелАМ пад кіраўніцтвам Сяргея Кафанава.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ